# ВЫПРАБАВАННІ ДЛЯ САПРАЎДНЫХ МУЖЧЫН

У інтэрнаце №3 прайшоў штогадовы конкурс «Супермен інтэрната». За гэтае званне змагаліся чатыры харызматычныя і абаяльныя хлопцы: Яўген Галаўко (МГФ), Анатоль Мосін (ФлФ), Дзмітрый Лукашэнка (МГФ), Арцём Артамонаў (БФ).




Першы этап конкурсу «Армейская кухня» аказаўся складаным нават для дзяўчат: трэба было назваць як мага больш страў, якія можна прыгатаваць з бульбы. Стравы хлопцы называлі па чарзе, а той, хто доўга думаў, выбываў з гульні. Аказалася, што і хлопцы ведаюць шмат бульбяных страў, але самым дасведчаным у гэтым конкурсе стаў Анатоль Мосін. Наступны этап пад назвай «Баявое раненне» таксама быў няпростым. Кожны ўдзельнік выцягваў картку, дзе было пазначана месца (рука, нага, вока і інш.), у якое ён «паранены». Затым, дэманструючы канкрэтнае «раненне», неабходна было на адлегласці закінуць мячык у карзіну. Самым спрытным стаў Дзмітрый Лукашэнка. Напэўна, адным з самых цікавых і займальных як для ўдзельнікаў, так і для гледачоў стала спаборніцтва «Майстар на ўсе рукі». Хлопцам трэба было прышыць гузік і пачысціць бульбу. І тут ацэньвалася найперш не хуткасць, а якасць выканання. Заключным этапам конкурсу стала праверка спартыўных здольнасцей удзельнікаў: неабходна было як мага больш і правільна аджацца ад падлогі.

На працягу ўсяго мерапрыемства гледачы актыўна падтрымлівалі ўдзельнікаў: сваіх сяброў, аднагрупнікаў, знаёмых. Пакуль члены журы раіліся між сабой, хто ж атрымае званне «Супермен інтэрната», а ўдзельнікі адпачывалі, вядоўцы Марта Курловіч (МГФ) і Ірына Фралова (МГФ) задавалі пытанні «з разынкай» гледачам, якія, як і ўдзельнікі конкурсу, аказаліся вельмі ўважлівымі і таму лёгка справіліся.

Хоць журы было і няпроста вызначыць пераможцу, званне «Супермен інтэрната» атрымаў Анатоль Мосін. Астатнія хлопцы таксама былі адзначаны ў наступных намінацыях: «Суперспартсмен» – Арцём Артамонаў, «Суперсмайл» – Яўген Галаўко, «Суперснайпер» – Дзмітрый Лукашэнка. Віншуем!

**Дзіяна ЛОСЬ,**
**студэнтка 5 курса**
**ФлФ.**